# Весці

**БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

## № 2 (24) 2000

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

***Галоўны рэдактар:***
Л. Н. Ціханаў

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
І. А. Новік
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. В. Фіялкоўская (*адказны сакратар*)
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

## ЗМЕСТ

***Педагогіка***

*Савушкіна А. В.* Дзіцячы рух: погляд у мінулае .................3

*Алоўнікава Н. Г., Анікіевіч А. М.* Выкарыстанне лінгвакраіназнаўчай методыкі на занятках замежнай мовы на спецыяльных факультэтах педагагічнай ВНУ ...........8

*Василяускас Р. А.* Культурологический и исторический подходы в изучении литовской народной педагогики ...........12

***Псіхалогія***

*Плаўнік Н. К.* Крызіс самавызначэння ў раннім юнацкім узросце ў святле культурна-гістарычнай тэорыі .....17

*Сотнікава Т. А.* Аб сямейных псіхатраўміруючых фактарах дзяцінства .....................20

***Філасофія***

*Мартынаў М. І., Навагродскі В. Я.* Асаблівасці працэсу сацыялізацыі моладзі ў сучасных умовах ..........................28

***Мовазнаўства***

*Рагаўцоў В. І.* Сінонімы як сродак стварэння камічнага эфекту ў беларускай драматургіі ..........................34

*Бунцевич Л. М.* Распространенность и функционирование прилагательных с без- (*bez-) в русском и белорусском языках ..........................39

*Мормыш Л. С.* Белорусизмы в переводных текстах произведений М. Горецкого ..........................45

***Літаратуразнаўства***

*Ганчарова-Цынкевіч Т. У.* Вобраз Мадонны ў творчасці Максіма Багдановіча ..........................51

*Тычка Г. К.* Польская культурная традыцыя і Янка Купала ..........................56

*Логвин Т. М.* К проблеме диалога национальных культур ..........................61

*Дынько А. В.* Выкарыстанне мадэлі лабірынта ў рамане Джона Фаўлза «Маг» ..........................66

*Студенко Т. С.* Идеи трансцендентализма и американского романтизма в творчестве Г. Джеймса........70

***Музыказнаўства***

*Яшчанка В. М.* Пра часавую прымеркаванасць карагодаў Магілёўшчыны ..........................77

УДК 947.085(476)

БДПУ + 9(с3)2

*А. В. Касовіч*

# Асаблівасці ваенна-палітычнага жыцця ў заходніх абласцях Беларусі (1941—1944 гг.)

У апошнія гады беларускімі гісторыкамі была праведзена вя-лікая работа па вывучэнню асаблівасцяў ваенна-палітычнага жыц-ця ў заходніх абласцях Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вай-ны, уведзена ў навуковы абарот значная колькасць невядомых да-кументаў. Цікавасць прадстаўляюць матэрыялы беларуска-поль-скіх навуковых канферэнцый па гісторыі Арміі Краёвай (АК), што адбыліся ў рэспубліцы [1—2], манаграфій [3—4] ды інш. Трэба адзначыць, што большасць публікацый прысвечана баявой дзейна-сці Арміі Краёвай, другім жа пытанням ваенна-палітычнага жыц-ця ўдзяляецца менш увагі.

У артыкуле ўпершыню ажыццяўляецца спроба разгледзець гэту праблему комплексна.

Разам з савецкімі партызанскімі фарміраваннямі на акупіра-ванай тэрыторыі заходніх, паўднёвых і часткова цэнтральных аб-ласцей Беларусі, сучасных Брэсцкай і Гродзенскай абласцей у га-ды Вялікай Айчыннай вайны дзейнічалі арганізацыі антысавец-кай накіраванасці, якія праследавалі ўласныя мэты і задачы. Ся-род іх вылучаюцца польскія ўзброеныя фарміраванні падпольнай нацыяналістычнай арганізацыі Арміі Краёвай, утворанай павод-ле рашэння польскага лонданскага эмігранцкага ўрада В. Сікор-скага 14 лютага 1942 г. на базе «Саюза ўзброенай барацьбы». Ён узнік у верасні 1939 г, а фактычна дзейнічаў у падполлі на тэрыторыі Польшчы і заходніх абласцях Беларусі яшчэ з каст-рычніка 1939 г.

Разглядаючы заходнюю частку Беларусі як частку Польшчы, Лонданскі эмігранцкі цэнтр яшчэ ў кастрычніку 1939 г. прыняў рашэнне аб разгортванні тут польскага руху супраціўлення, у ме-жах якога з 1942 г. дзейнічала і Армія Краёва [5].

На пачатковым этапе сваёй дзейнасці АК займалася арганіза-цыйнай і палітычнай работай, фарміраваннем шырокай сеткі падпольных структур і скрытых рэзерваў, назапашваннем зброе-вага арсеналу, абмундзіравання і правіянту, арганізацыяй ваен-нага навучання і разведкі, стварэннем штабоў, вяла добра спла-наваную работу сярод польскага насельніцтва заходніх абласцей Беларусі [6].

Да лета-восені 1943 г. АК, зыходзячы з агульнай стратэгіч-най мэты галоўнага камандавання, не вяла актыўных баявых

дзеянняў на тэрыторыі рэспублікі ні супраць немцаў, ні су... беларускіх партызан. На ўтварэнне асобных атрадаў і іх ... насць у 1942—1943 гг. уплывала рэакцыя мясцовага насел... ва на перамогі Чырвонай Арміі пад Сталінградам і на Кур... дузе. Шмат чаго залежала ад пазіцыі таго ці іншага каманд... паколькі адсутнічала пастаянная сувязь з цэнтрам [7].

У цэнтральны штаб партызанскага руху паступалі звест... камандавання беларускіх партызанскіх атрадаў аб тым, што ... выя групы АК вялі барацьбу супраць немцаў, усяляк дапам... чырвонаармейцам, якія збеглі з палону, зброяй, адзеннем, ... дуктамі, ахвотна залічвалі іх у баявыя атрады. Адзначаны ... падкі перадачы разведвальнай інфармацыі савецкаму ... больш цесных кантактаў з беларускімі партызанамі [7]. Сав... і польскія партызанскія фарміраванні абменьваліся ўзаемн... фармацыяй аб становішчы на франтах, у акупіраваных нем... краінах, у сваіх раёнах дамаўляліся аб сумесных дзея... супраць варожых карных аперацый.

Такім чынам, да восені 1943 г. у асабістага саставу і каман... вання асобных фарміраванняў АК з беларускімі партызан... фарміраваннямі ўсталяваліся нармальныя і нават сяброўскія ... носіны.

Прыкладам гэтага можа быць дзейнасць Стаўбцоўска-Н... боцкага батальёна АК, які актыўна падтрымліваў сувязь з пар... тызанамі брыгады імя Чкалава і прымаў удзел разам з імі ... баявых аперацыях супраць гітлераўцаў. Сумесна была распра... вана і паспяхова ажыццёўлена 19—20 чэрвеня 1943 г. апера... па разгрому буйнога нямецкага гарнізона ў г. п. Івянец, які ... лічваў звыш 300 добра ўзброеных гітлераўцаў [8].

Паводле даных даследчыка А. Ю. Васько, з моманту ўз... нення ў 1942 г. да ліпеня 1943 г. толькі атрадамі Навагруд... акругі АК былі праведзены 102 узброеныя акцыі супраць гіт... раўскіх войск і мясцовай паліцыі. Гэтыя дзеянні атрадаў ... яўна супярэчылі ўстаноўкам лонданска-эміграцкага цэнтра ... захаванні «ўзброенага нейтралітэту» на дадзеным этапе народн... барацьбы [9].

Іншы характар набылі адносіны АК і савецкіх партызан у ... ходніх абласцях Беларусі пасля разрыву ў красавіку 1943 ... дыпламатычных адносін паміж СССР і польскім эміграц... урадам В. Сікорскага ў Лондане ў сувязі з Катынскай трагедыя... пра якую паведамлялася ў нямецкім, польскім і беларускім (на... цыяналістычным) друку.

З гэтага часу абвастраецца ідэалагічнае і ўзброенае про... стаянне, узмацняюцца тэндэнцыі да канфрантацыі фарміра... няў АК з партызанскім рухам і прамога выкарыстання іх у анты... савецкіх мэтах, што прыводзіла да ўзброеных сутыкненн...

і канфліктаў, міжусобнай вайны. Яе ініцыятарамі, як пацвярджаюць дакументы і сведчанні відавочцаў, стала камандаванне АК [10—12].

Абодва бакі — і польскія, і савецкія фарміраванні — не выказалі належнай вытрымкі і такту ў справе вырашэння канфлікту і ўзмацнення баявой садружнасці ў барацьбе супраць агульнага ворага — фашысцкай Германіі. Замест гэтага, як сведчаць архіўныя дакументы, яны атрымалі адпаведныя інструкцыі ад свайго кіраўніцтва і звярнуліся да крайніх і непрадуманых дзеянняў [7—8].

Супярэчнасці яшчэ больш узмацніліся з чэрвеня 1943 г. пасля рассылкі ўсім партыйным органам закрытага ліста ЦК КП(б)Б «Аб ваенна-палітычных задачах работы ў заходніх абласцях БССР». У ім вызначаліся асноўныя крытэрыі, якімі павінны былі кіравацца ў сваёй дзейнасці падпольныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі адносна польскіх узброеных фарміраванняў. Асобна адзначалася, што заходнія вобласці з'яўляюцца састаўной часткай БССР і на захопленай тэрыторыі дапушчальны толькі дзеянні арганізацый, атрадаў і груп, якія кіруюцца інтарэсамі СССР [12].

Савецкія партызанскія фарміраванні прыступілі да стварэння ў сваіх радах польскіх атрадаў і груп, павялі актыўную агітацыю сярод мясцовага польскага насельніцтва па расколе і знішчэнню польскага нацыяналістычнага падполля і пашырэнню сваіх радоў.

Першая аперацыя па раззбраенню атрадаў АК праходзіла на Віленшчыне. Камандзір партызанскай брыгады Ф. Маркаў раззброіў брыгаду АК, 50 чалавек былі расстраляны. 70 байцоў перадалі па атрадах брыгады, частку ўключылі ў зноў утвораны польскі атрад. Па падобнай схеме раззбройваліся і астатнія фарміраванні АК.

З восені 1943 г. фарміраванні АК прыпынілі баявыя аперацыі і іншыя дзеянні супраць немцаў, а асобныя атрады нават актывізавалі барацьбу супраць беларускіх партызан і мясцовага насельніцтва, не падзяляючага мэт гэтай арганізацыі [14].

Баі паміж АК і партызанамі з другой паловы 1943 г. і да чэрвеня 1944 г. сталі частымі. Так, акаўцы пры падтрымцы мясцовага насельніцтва «выцеснілі» савецкіх партызан з Ашмянскага, Смаргонскага, Астравецкага раёнаў, перакрылі сюды ўсе падыходы цераз раку Вілію. Яны перайшлі да форм узброенага супраціўлення спробай савецкага боку ўплываць на заходнюю частку вобласці. За 1943 г. толькі ў Віленскай вобласці было забіта і паранена каля 150 савецкіх партызан і каля 100 чалавек прапалі без вестак [15].

Пачынаючы са снежня 1943 г. і да пачатку беларускай наступальнай аперацыі «Баграцён», у чэрвені 1944 г., а менавіта на

працягу шасці месяцаў, кіраўніцтва фарміраванняў АК у заходніх абласцях Беларусі стала на шлях прамога супрацоўніцтва і сумесных выступленняў з нямецкім камандаваннем і акупацыйнымі ўладамі ў барацьбе з актыўным у краі партызанскім рухам і антыфашысцкімі арганізацыямі [16].

Пад лозунгам «Абароны польскага насельніцтва раёна ад савецкіх партызан» польскія легіянеры з-пад Івянца ў сакавіку — красавіку 1944 г. здзейснілі пагромныя напады на партызанскія вёскі ў Івянецкім, Дзяржынскім, Заслаўскім раёнах, забівалі партызан і іх сем'і, мірных жыхароў, палілі населеныя пункты, арганізоўвалі засады і нападалі на невялікія групы партызан. Ад іх рук на тэрыторыі Заходняй Беларусі загінулі сотні людзей, часам знішчаліся цэлыя сем'і. Паводле няпоўных даных, толькі на Лідчыне за 1943—1944 гг. акаўцамі было забіта звыш 1200 мірных жыхароў [17].

Згодна з афіцыйнымі данымі, толькі з восені 1943 па лета 1944 г. атрады Навагрудскай акругі АК правялі 81 баявую аперацыю супраць беларускіх партызанскіх фарміраванняў. Гэта былі не толькі дробныя сутычкі, але і баі, у якіх удзельнічалі сотні байцоў з абодвух бакоў [18].

Акаўцы заўсёды лічылі сябе поўнаўладнымі гаспадарамі на беларускай зямлі, і сваю ўладу яны не збіраліся дзяліць ні з кім, ні з фарміраваннямі Беларускай Краёвай Абароны, якія хацелі бачыць Беларусь незалежнай краінай, ні з беларускімі партызанамі, якія змагаліся за савецкую ўладу.

Пры дапамозе насілля, прымусу і зверстваў яны спадзяваліся вырашыць «беларускае пытанне». Прысутнасць АК на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі супярэчыла інтарэсам большасці карэннага насельніцтва гэтага рэгіёну, які на 80% складаўся з беларусаў, а яе дзейнасць негатыўна адбілася на кансалідацыі антысавецкіх сіл у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, асабліва ў перыяд іх выгнання з тэрыторыі рэспублікі.

Нельга адмаўляць гераізм і мужнасць радавых салдат і афіцэраў акаўскіх фарміраванняў, баявыя подзвігі асобнай дыверсійнай арганізацыі АК, дзейнасць якой налічвае дзесяткі ўзарваных чыгуначных эшалонаў праціўніка, у тым ліку на тэрыторыі акупіраваных заходніх абласцей Беларусі, вялікую колькасць знішчаных нямецкіх салдат і афіцэраў. Тысячы акаўцаў загінулі ў баях з фашысцкімі акупантамі.

Дзейнасць фарміраванняў АК на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі, яе ўзаемаадносіны з савецкімі партызанамі, з мясцовым насельніцтвам, а таксама супрацоўніцтва з нямецка-фашысцкімі акупацыйнымі органамі неабходна разглядаць у кантэксце рэальнага гістарычнага працэсу савецка-польскіх адносін, усяго комплексу існаваўшых праблем.

## ЛІТАРАТУРА, КРЫНІЦЫ

1. Тэзісы чацвёртай навуковай канферэнцыі беларускіх і польскіх гісторыкаў 6—7 кастрычніка 1994 г. Гродна, 1994.

2. Армия Крайова: военные, политические и правовые аспекты деятельности на Беларуси //Материалы научной конференции 14 апреля 1996. Мн., 1996.

3. *Сямашка Я.* Армія Краёва на Беларусі. Мн., 1994.

4. *Ермолович В. И., Жумарь С. В.* Огнем и мечом: Хроника польского националистического подполья в Белоруссии 1939—1953 гг. Мн., 1994.

5. *Снітко А.* З кім ваявалі акаўцы //Літаратура і мастацтва. 1992. 23 кастр.

6. *Безвершенко А.* Гимн Армии Крайовой для «голоса» с военным оркестром //Знамя юности. 1995. 22 авг.

7. *Гуленка У.* «Акаўцы» і «бульбаўцы», «аўнаўцы»... Ці былі ў Беларусі антыфашысцкія і адначасова антысавецкія партызанскія фарміраванні або арганізацыі //Звязда. 1991. 20 лют.

8. *Хацкевіч А.* Над Нёманам і Ашмянкай //Звязда, 1991. 27 снеж.

9. *Іоффе Э.* Армия Крайова: кто есть кто? //Республика. 1994. 18 нояб.

10. *Літвін А. М., Паўлаў Я. С.* Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны //Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1995. Ч. 2. С. 265— 324.

11. Гісторыя Беларусі: У 2 т. Мн., 1998. Т. 2. С. 254—265.

12. НА РБ. Ф. 3500. Воп. 23. Спр. 47. Л. 159.

13. НА РБ. Ф. 3500. Воп. 2. Спр. 49. Л. 288.

14. *Барадулін А. М., Кісялёў В. К.* Беларусь у гады другой сусветнай вайны. Мн., 1995. С. 26.

15. НА РБ. Ф. 3500. Воп. 2. Спр. 49. Л. 289.

16. *Чобат А.* Армія Краёва на Беларусі //Літарутура і мастацтва. 1994. 2 снеж.

17. *Васільчак М.* Аб узаемаадносінах партызан і Арміі Краёвай на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1941—1944 гг. Беларусь у гады другой сусветнай вайны: урокі гісторыі і сучаснасць. Мн., 1995. С. 33.

18. *Ермаловіч В.* Партызаны, партызаны, беларускія сыны //Беларусь. 1995. № 5. С. 8.

## SUMMARY

*The Polish military groups of the Krayovay Army with the Soviet partisans were op the territory of the occupied Western region of Belarus duru, y the uears of the Great Patriotic War.*

*Krayova Armi didn`t take part in the battles neither against Germans nor against the Belarusian partisans till the summer-autumn, 1443. Since autumn 1443 Krayova Army had been used for antisoviet purposes.*